ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ НАН БЕЛАРУСІ
САВЕТ МАЛАДЫХ ВУЧОНЫХ ІНСТЫТУТА ГІСТОРЫІ
запрашае да ўдзелу ў

# II канферэнцыі маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі «ARS LONGA: НАВУКОВЫЯ ДАСЯГНЕННІ, ПРАЕКТЫ, ПЕРСПЕКТЫВЫ»

## 4-5 красавіка 2019 г., Мінск

Інфармацыйны ліст № 1

Шаноўныя калегі!

Канферэнцыя маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі «ARS LONGA: навуковыя дасягненні, праекты, перспектывы» упершыню была арганізавана ў 2018 г. па ініцыятыве Савета маладых вучоных НАН Беларусі. Цікавасць да дакладаў калегаў праявілі не толькі маладыя супрацоўнікі Інстытута гісторыі, а таксама прадстаўнікі Саветаў маладых вучоных шэрагу ўстаноў навукі і адукацыі, што прывяло да неабходнасці правесці чарговую канферэнцыю, пашырыўшы склад удзельнікаў.

Правядзенне **II канферэнцыі маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі «ARS LONGA: навуковыя дасягненні, праекты, перспектывы»** плануецца як мерапрыемства, прысвечанае 90-годдзю Інстытута гісторыі і пройдзе **4-5 красавіка 2019 г.** Папулярызацыя дасягненняў Інстытута гісторыі НАН Беларусі сярод творчай моладзі, зацікаўленай у прафесійнай навуковай дзейнасці, з'яўляецца найважнейшым напрамкам работы Савета маладых вучоных.

Запрашаем маладых навукоўцаў, лабарантаў, аспірантаў, магістрантаў і студэнтаў старэйшых курсаў прэзентаваць праекты і даследаванні апошніх гадоў. Мы ўпэўнены, што правядзенне такой сустрэчы паспрыяе развіццю прафесійных кантактаў паміж маладымі даследчыкамі і актывізуе творчы пошук.

**Заяўкі** на ўдзел у канферэнцыі ў **рэжыме on-line** прымаюцца да **31 студзеня 2019 г.** Запоўніць форму заяўкі можна па адрасе: заяўкаІІКМ. Тэзісы дакладаў (аб'ёмам да 3 тыс. знакаў разам з прабеламі) прымаюцца да **15 лютага 2019 г.** у электронным выглядзе на адрас arslonga2019@gmail.com. Усе атрыманыя матэрыялы пройдуць навуковае рэцэнзаванне, па выніках якога Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору дакладаў, а таксама пераносу часткі з іх у постэрную форму.

Праезд і пражыванне ўдзельнікаў канферэнцыі ажыццяўляецца за кошт камандзіруючага боку.

Мы будзем удзячны за распаўсюджванне інфармацыі аб канферэнцыі.

**Кантактны тэл.:** Ганна Ясковіч +375 29 871-73-79,
Святлана Велент-Шчэрбач +375 29 338-70-41

**E-mail:** arslonga2019@gmail.com